**24.** Выберыце дзеясловы, якія ў форме 2-ой асобы множнага ліку будучага часу маюць канчатак ***-яце***:

*1) адбіраць; 2) заступіць; 3) напасці; 4) атрэсці; 5) дажыць.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**25.** Вызначце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік:

*1) Дождж ліў _ як з вядра.*
*2) Без навукі, братка, чалавек _ што сляпое кацянятка.*
*3) Стракозы _ быццам верталёцікі.*
*4) Лес _ ціхі, таямнічы.*
*5) Усе _ як адзін.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**26.** У якім сказе з дадзеных дапушчана пунктуацыйная памылка?

*1) Ні слупоў, ні платоў, ні хат, нічога не было відаць.*
*2) Гэты поплаў, і рэчка, і вярба над ёй – адным словам, усё выглядала незвычайна.*
*3) І не хопіць рук, і не хопіць вачэй, каб абняць усю родную далячынь, і стракаты дыван лугоў, і небасхіла шыр.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** усе сказы запісаны правільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**27.** Вызначце пары словазлучэнняў са словамі-амонімамі:

*1) аблазіць усе вадаёмы – заяц аблазіць вясной;*
*2) аўсянка з маслам – аўсянка падобная да вераб'я;*
*3) бальныя танцы – бальная сістэма адзнак;*
*4) выраз для рукавоў – выраз твару.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**28.** У ролі якой часціны мовы ўжыты лічэбнік *адзін* у сказе:

*Пракоп ішоў дадому адзін.*

**А)** назоўнік. **Б)** прыметнік. **В)** лічэбнік. **Г)** прыслоўе. **Д)** займеннік.

**29.** Дапоўніце прыказку: *Апарыўся на капусце ў гаршку, то і ... .*

*1) на вушы не лезе; 2) пагаворым аб прыгодзе; 3) вады баяўся;*
*4) на гародзе дзьмухаў; 5) пад'еў лебяды.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**30.** Якога слова не хапае ў афарыстычным выказванні Алеся Разанава:

*"Размова – мова думак, маўчанне – мова ..."*?

**А)** слухання. **Б)** цішыні. **В)** філасофіі. **Г)** роздуму. **Д)** ісціны.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218, тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 12000 экз. г. Мінск. 2013 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2013»

*Чацвер, 21 лютага 2013 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 9 класаў

**1.** Закончыце народнае выслоўе: *"Дзе бусел вядзецца, там ... ."*

**А)** чалавеку не месца. **Б)** сарока смяецца. **В)** пчолы мёд не збіраюць. **Г)** бярозка ўецца. **Д)** шчаслівае месца.

**2.** Як правільна напісаць у словазлучэнні прыметнік, утвораны ад назоўніка *ластаўка*?

*1) ластаўчына гняздо; 2) ластаўкава гняздо; 3) ластаўчынава гняздо.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**3.** Дапоўніце вершаваны радок з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля":

*Ідуць касцы, звіняць іх ... .*

**А)** росы. **Б)** косы. **В)** галасы. **Г)** крокі. **Д)** песні.

**4.** Вучань пры выкананні задання зрабіў запісы:

*1) поле не засеяна; 2) не засеянае поле; 3) не засеянае з вясны поле.*

Які запіс вучань зрабіў няправільна?

**А)** усе запісы зроблены правільна. **Б)** усе запісы зроблены няправільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**5.** Якія прыметнікі з дадзеных запісаны правільна?

*1) лімоны; 2) дзённы; 3) асені; 4) раменны; 5) кішэны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**6.** Дапоўніце выразы:

*1) дрыжыць, як …; 2) здаравенны, як …; 3) нахілілася, як … .*

*а) дуб; б) вярба; в) асіна; г) таполя.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-г, 2-а, 3-б. **В)** 1-в, 2-а, 3-б.
**Г)** 1-б, 2-г, 3- в. **Д)** 1-в, 2-б, 3-г.

**7.** Выберыце з прыведзеных словы, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ь***:

*1) ледз..ве; 2) печ..; 3) ц..мяны; 4) дз..ве; 5) сем..; 6) палын.. .*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4, 6. **Г)** 3, 5. **Д)** 4, 6.

**8.** У якіх словах з дадзеных правільна пастаўлены націск?

*1) кру́цель; 2) гры́млівы; 3) бры́во; 4) крупі́на; 5) са́джанец.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**9.** У якім з прыведзеных назоўнікаў “схавалася” прыслоўе?

*1) маліна; 2) каліна; 3) яліна; 4) ясень.*

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**10.** Якія словы з дадзеных неабходна напісаць праз злучок?

*1) птушка..гадоўля; 2) дзярж..выдавецтва; 3) стоп..сігнал;*
*4) шум..гам; 5) ультра..модны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**11.** Вызначце від сказа: *Янкаву дрымоту як рукой зняло.*

**А)** назыўны. **Б)** пэўна-асабовы. **В)** няпэўна-асабовы.
**Г)** абагульнена-асабовы. **Д)** безасабовы.

**12.** Пераблыталіся літары слова-разгадкі народнай загадкі:

*Хата кругом свеціцца.*

Выберыце правільны адказ.

**А)** к, ш, ы, к, о. **Б)** к, о, з, а, б, н. **В)** а, з, а, в.
**Г)** т, о, л, с. **Д)** к, ю, л, а, м, н, а.

**13.** Дадзены назоўнікі:

*1) вечар; 2) нагор’е; 3) насмешнік; 4) галопам; 5) шмат.*

Якія словы маюць нулявы канчатак?

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**14.** У якіх словах на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***з***?

*1) бе..казырка; 2) ..жаць; 3) бя..пройгрышны; 4) у..кочыць;*
*5) у..бегчы; 6) ..чарнець; 7) ра..кінуць.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 1, 4, 6. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 6, 7.

**15.** Вызначце, у якім(-іх) сказе(-ах) на месцы пропуску неабходна напісаць зваротны займеннік *сабе:*

*1) Сам ад … не збяжыш нікуды.*
*2) Хто людзям не верыць, той і … веры не дасць.*
*3) Так я выбраў … свой жыццёвы шлях.*
*4) Чаго … не жадаеш, таго і другому не зыч.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** ва ўсіх сказах, акрамя 1. **В)** 1, 3. **Г)** 2. **Д)** 3, 4.

**16.** З якімі словамі з дадзеных часціца ***ні*** пішацца асобна?

*1) (ні) хто; 2) (ні) даць (ні) узяць; 3) (ні) куды;*
*4) (ні) душы няма; 5) (ні) быта; 6) (ні) шчымны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 6.

**17.** *Гук, які раптоўна абрываецца, – … .*

**А)** адрывісты. **Б)** адрыўны. **В)** адрывачны. **Г)** адарваны. **Д)** падарваны.

**18.** *Два злучаныя гліняныя гаршчочкі з ручкай, у якіх насілі ежу ў час палявых работ,* у народзе здаўна называюць … .

**А)** спарыш. **Б)** кубел. **В)** кубак. **Г)** збан. **Д)** цэбар.

**19.** Выберыце прыклады, у якіх прыметнікі неабходна напісаць з вялікай літары:

*1) (Г, г)ордзіеў вузел; 2) (К, к)оласаўская мова;*
*3) (С, с)ізіфава праца; 4) (К, к)упалаўскія вершы.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**20.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску неабходна напісаць спалучэнне ***ія***?

*1) ак..н; 2) арх..логія; 3) міл..рд; 4) алімп..да; 5) б..графія.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 4, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**21.** Вызначце з дадзеных словазлучэнне, у якім падкрэсленае слова ўжыта правільна:

*1) <u>генеральская</u> ўборка; 2) <u>глiністая</u> глеба; 3) <u>ураджайная</u> зямля.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Вучні выпісвалі з тэксту словы, якія маюць прыстаўку:

*1) абарона; 2) устойлівы; 3) повар; 4) нарада; 5) паверхня.*

Якія прыклады выпісаны правільна?

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**23.** У якіх словазлучэннях правільна ўтворана склонавая форма назоўніка?

*1) трое чалавекаў; 2) па выніках праверкі; 3) група мінчан;*
*4) табун коней; 5) не спаць па начам.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 4, 5.